За апошнія чатыры гады дасягненні БДУКМ у міжнародным рэйтынгу дэманструюць станоўчую дынаміку: у 2014 г. БДУКМ займаў 28-е месца; у 2015 г. – 27-е; у 2016 г. – 22-е.

*Ацэнка ўзроўню прэстыжнасці БДУКМ: пазіцыя спажыўцоў*

Пазітыўны імідж БДУКМ адзначаюць таксама і студэнты ўніверсітэта, і прафесарска-выкладчыцкі састаў (ПВС). Так, 24,2 % першакурснікаў і 66,3 % выпускнікоў лічаць БДУКМ самай прэстыжнай УВА. 44,2 % першакурснікаў перакананыя, што менавіта ў БДУКМ яны атрымаюць неабходны ўзровень тэарэтычных ведаў, а 76,7 % – неабходны ўзровень практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці. 68,9 % ПВС (у 2015/2016 н. г. – 69,0 %) лічаць месца працы ў БДУКМ, у параўнанні з іншымі УВА Беларусі, больш прэстыжным.

Паляпшэнне іміджавых крытэрыяў БДУКМ аказвае прамое ўздзеянне на канкурэнтаздольнасць універсітэта культуры і мастацтваў сярод іншых беларускіх УВА, што прыцягвае ўвагу абітурыентаў.

Такім чынам, «мысленне на аснове рызык» дазваляе творчай УВА не толькі вызначыць тыя фактары, якія могуць стаць прычынамі невыканання запланаваных мэт у галіне якасці, але і дапамагчы пазбегнуць (або мінімізаваць) негатыўныя вынікі такіх прычын і знайсці магчымасці для выканання патрабаванняў спажыўцоў і павышэння іх (спажыўцоў) ступені задаволенасці якасцю адукацыйных паслуг, што дасць магчымасць і ў далейшым умацоўваць пазіцыі БДУКМ у сферы культуры.

## ІНВЕНТАР НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ: СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ

***А. А. Гулак,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

З моманту далучэння нашай краіны да Канвенцыі па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС, 2004) і ратыфікацыі яе (2007) у беларускім грамадстве актывізаваліся



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсы ўсебаковага асэнсавання сферы, што ў міжнароднай практыцы мае назву Intangible Cultural Heritage. Мы спынімся на адной з цэлага шэрагу мер, прадугледжаных артыкуламі 12, 13 Канвенцыі, – складанне пералікаў аб'ектаў НКС, якія існуюць на тэрыторыі дзяржавы.

НКС трактуецца як *сацыякультурная з'ява, якая служыць фактарам самаідэнтыфікацыі і культурнай самарэалізацыі людзей, крыніцай культурнай разнастайнасці і базай устойлівага развіцця грамадства*.

Каардынацыяй работы па выяўленні, ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльнай спадчыны Беларусі займаецца спецыяльны Цэнтр экспертыз па ахове НКС, створаны ў 2012 г. на базе Інстытута культуры Беларусі. Экспертызу на міжнародным узроўні ажыццяўляе Студэнцкае этнаграфічнае таварыства (СЭТ), якое выконвае кансультатыўныя функцыі пры Міжурадавым камітэце ЮНЕСКА. (У снежні 2013 г. СЭТ акрэдытавана ЮНЕСКА як арганізацыя з прызнанай кампетэнцыяй у сферы аховы НКС, якая выконвае кансультатыўныя функцыі). Працэдуру ўнясення ў Спіс элементаў НКС ажыццяўляе Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Вырашэнню практычных задач, якія стаяць перад асобнымі спецыялістамі, установамі культуры, няўрадавымі арганізацыямі, экспертамі і дзяржаўнымі органамі кіравання культурай, – усімі тымі, хто ўключаны ў працэс ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі НКС, садзейнічае спецыяльнае выданне «Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны: Практычнае кіраўніцтва» (2013), падрыхтаванае А. Сташкевіч у адпаведнасці з міжнароднай практыкай у гэтай галіне.

Нацыянальны інвентар НКС Беларусі створаны дзякуючы кансультатыўнай і фінансавай падтрымцы ЮНЕСКА (база даных і рэсурс «Жывая спадчына Беларусі»). «Гэта не толькі база даных і адпаведны сайт, – піша А. Сташкевіч, – а ў першую чаргу многія арганізацыі, эксперты і носьбіты спадчыны з усіх рэгіёнаў Беларусі. Інвентар пастаянна папаўняецца новымі элементамі, «вырошчваецца» супольнасцямі, групамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і асобнымі людзьмі, зацікаўленымі ў такой далікатнай матрыцы культуры» [1, с. 4].

Прыкладам таго, наколькі важныя ініцыятывы і грамадская актыўнасць груп і асобных людзей, з’яўляецца гісторыя ўключэння ў Спіс элементаў НКС карагода «Стрылка» в. Бездзеж Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. На пачатковым этапе гэта з’ява традыцыйнай культуры была апісана студэнтамі філалагічнага факультэта БДУ падчас праходжання фальклорнай практыкі, а потым была падтрымана спецыялістамі. Ініцыятыва дакументавання, даследавання і захавання абраду «Насіць намётку» в. Папшычы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці таксама ўзнікла ва ўніверсітэцкай аўдыторыі. Яна сыходзіла ад тагачаснага студэнта гістарычнага факультэта БДУ Д. Філіпчыка, які здолеў прыцягнуць увагу спецыялістаў і сам актыўна ўдзельнічаў у «станаўленні» гэтага аб’екта НКС.

У фарміраванні Спіса элементаў НКС рэалізоўваецца *прынцып збалансаванасці паміж матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчынай* і *прынцып неўжывання элітнага адбору*, які прадугледжвае падтрымку ўсіх форм НКС, незалежна ад іх прэстыжнасці, маштабнасці, унікальнасці. У якасці прыкладу неўжывання элітнага адбору пры фарміраванні Спіса НКС можна прывесці традыцыю вырабу валёнак Міёрскага раёна Віцебскай вобласці, традыцыйную тэхналогію пляцення лапцей і творчасць майстроў-шапавалаў Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці, традыцыі ганчарнай вытворчасці з аўтэнтычнымі элементамі в. Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці і інш. На сёння ў інвентары 60 адзінак: традыцыйныя цырымоніі – 21 адзінка, светапогляд людзей, міфалогія – 4 адзінкі, выканальніцкае майстэрства – 12 адзінак, традыцыйныя рамёствы – 20 адзінак, традыцыйныя стравы – 3 адзінкі [2].

Перспектывы выяўлення, ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі НКС Беларусі стварае *трансляцыя аб’ектаў НКС, уключаных у інвентар, у адукацыйнай і культурнай прасторы Беларусі; актывізацыя ўдзелу носьбітаў традыцыі* (супольнасцей і асобных людзей) *у папаўненні інвентара*. Таксама перспектыўным з’яўляецца *развіццё навуковага дыскурсу па праблемах НКС*.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.* Жывая спадчына Беларусі : нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі : каталог / А. Сташкевіч [і інш.] ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. – Мінск : Інбелкульт, 2014. – 164 с.

*2.* Жывая спадчына Беларусі [Электронны рэсурс] / Facebook. – Рэжым доступу: http://www.livingheritage.by. – Дата доступу: 01.03.2017.

## ТЕАТРАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА МАРИУПОЛЯ В НЕЗАВИСИМОЙ УКРАИНЕ (С 1991 г.)

***О. А. Демидко,***
*аспирант Мариупольского государственного университета*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Объективная картина развития культуры может быть воспроизведена путем анализа культурных процессов, происходящих не только в центре страны, но и в самых отдаленных ее уголках. Среди ряда проблем современности нового осмысления требует изучение театрального искусства Северного Приазовья как самобытного художественного феномена. Особое место в развитии театральных традиций региона занимает мариупольский театр, имеющий своеобразную историческую судьбу.

Становление театральной культуры Мариуполя началось с конца XIX в. С тех пор, несмотря на трудности, которые возникали в городе, всегда работала профессиональная труппа.

Изучению развития театральной культуры Мариуполя посвящены краеведческие исследования С. Бурова, О. Гринько, Т. Коростелевой, С. Отченашенко, В. Чертушкина. Однако в научной среде указанной проблеме до сих пор не уделено должного внимания. Отсутствие специального историко-культурологического исследования и объективного научного изучения темы обусловливает актуальность представленного доклада.

С 1991 г. в Донецком академическом областном драматическом театре (г. Мариуполь) чувствовалось стремление по-ново-